**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у чэрвені**

У бібліятэках традыцыйна стартавалі Летнія чытанні «Лето в книжной компании».

**1 чэрвеня. ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі прынялі актыўны ўдзел у гарадскім свяце, прысвечаным **Міжнароднаму дню аховы дзяцей**. Былі падрыхтаваны займальныя гульнявыя праграмы і літаратурныя віктарыны. А кніжная выстава "Кніжкі не маюць канікулаў" дапамагала дзецям знайсці адказы на пытанні віктарыны і конкурсаў. *(Лунінецкія навіны. 2025. 4 чэрвеня. С.12)*

**4 чэрвеня**. У кафэ "СЛОТ" адбыўся дабрачынны "Аўкцыён дзіцячай творчасці" ў падтрымку дзейнасці інклюзіўнай арт-студыі "У фокусе палітры", якая працуе на базе Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Арт-студыя "У фокусе палітры" - гэта сацыяльны праект, які рэалізуецца трыма арганізацыямі-партнёрамі: аддзяленнем дзённага знаходжання для інвалідаў і суправаджанага пражывання ДУ "Лунінецкі ТЦСАН", Лунінецкай РА ГА "БелАІ" і ДУК "Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма". Лотамі аўкцыёна сталі творчыя работы дзяцей, якія займаюцца ў арт-студыі. *(Лунінецкія навіны. 2025. 4 чэрвеня. С.1)*

Работа бібліятэк ў летні перыяд праводзіцца ў цесным кантакце са школьнымі аздараўленчымі лагерамі.

**3 і 4 чэрвеня**. **Мікашэвіцкай г. б**. Адбылася адкрыццё праграмы летняга чытання "Пачытаем! Пагуляем! Адпачнем! Разам з кнігай лета правядзем!». Для дзяцей з прышкольных лагераў ДУА «Мікашэвіцкая гімназія імя У.І. Нядзведскага», ДУА «Сярэдняя школа №2» і ДУА «Цэнтр дзіцячай творчасці г. Мікашэвічы» прайшло свята дзяцінства «І зноў летняя пара - весяліцца дзятва».

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках.

**4 чэрвеня. Дрэбская сельская бібліятэка-клуб** правяла ў летнім лагеры "Светлячок" конкурсна-гульнявую праграму "Мы встречаем праздник лета, праздник солнца, праздник света". Падчас мерапрыемства дзеці прынялі ўдзел у пазнавальнай гульні, удзельнічалі ў розных конкурсах, паказвалі сваю сілу, знаходлівасць, кемлівасць.

**5 чэрвеня** ў **Ракітненскай с.б**. прайшла конкурсна-гульнявая праграма "Дружба моцная ў нас", **Лахвенская с.б**. запрасіла сваіх чытачоў на гульню-віктарыну на свежым паветры "Дзяцінства - цудоўная пара". Дзяцей пазнаёмілі з кнігамі аб жывёлах і раслінах нашай планеты, усе дружна адгадвалі загадкі і ўдзельнічалі ў конкурсе малюнкаў на асфальце.

**6 чэрвеня** ў **Бастынскай с.б**. прайшла тэматычная гадзіна "Дзяцінства – цудоўная пара", у **Лобчанскай** с.б. адбылася літаратурна-пазнавальная гадзіна "На бібліятэчнай паляне" інш.

**5 чэрвеня** ў храме ў гонар абраза Божай Маці «Спагнанне загінуўшых» г. Лунінец адбылося ўрачыстае падвядзенне вынікаў духоўна-патрыятычнага праекта «Лісты воінаў Бяссмертнага палка».

Праект быў ініцыяваны жыхарамі горада Палеск (Калінінградская вобласць, РФ) - пабраціма горада Лунінца. На Лунінеччыне ў правядзенні конкурсу ўдзельнічалі рэдакцыя газеты "Лунінецкія навіны" і ДУК "Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма". Галоўная мэта праекта - фарміраванне і развіццё ў маладога пакалення духоўна-маральных і патрыятычных каштоўнасцей, выхаванне моладзі на прыкладзе герояў, якія аддалі жыццё за Радзіму. Гэтыя лісты, напісаныя нам нашчадкам Вялікай Перамогі, нагадваюць пра той страшны і гераічны час, распавядаюць пра пачуцці людзей, якія перажылі вайну.

На падвядзенне вынікаў былі запрошаны ўсе ўдзельнікі конкурсу. Аўтары лепшых работ атрымалі падзякі і падарункі. Сярод узнагароджаных удзельніца народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Літаратурная правінцыя" Людміла Яфімава.

Супрацоўнікамі бібліятэчнай сістэмы ўсе лісты будуць накіраваны калегам у цэнтральную бібліятэку горада Палеск, з якімі ў 2024 годзе было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве, для далейшага ўдзелу ў праекце. *(Лунінецкія навіны. 2025. 11 чэрвеня.С.5)*

**5 чэрвеня. ЦРБ**. У чытальнай зале Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылася вечарына памяці мясцовага паэта Аляксандра Пятровіча Хаўдзеева «У неба высокае — чысты блакіт — песня птушыная рвецца».

На пачатку мерапрыемства бібліёграф азнаёміла прысутных з біяграфіяй паэта. Далей слова ўзяў кіраўнік народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Літаратурная правінцыя" Віктар Пінігін.

Удзельнікі студыі “Літаратурная правінцыя” на працягу ўсяго вечара дзяліліся ўспамінамі пра Аляксандра Хаўдзеева і чыталі яго вершы. Таксама быў прадэманстраваны відэаролік аб творчасці паэта.

**10 июня. ЦДБ.** У рамках Народнага ВідэаКалендара “Сонцазварот” прайшло мерапрыемства, прысвечанае святу Троіца. У бягучым годзе бібліятэкай рэалізуецца праект, мерапрыемствы якога прысвечаны вуснай народнай творчасці беларусаў, народным святам, звычаям і абрадам. Для дзяцей і падлеткаў праводзяцца вечары народных традыцый, фальклорныя вячоркі і г.д. Агульная мэта мерапрыемстваў – прывіць дзецям цікавасць і павагу да сваіх вытокаў і да нацыянальных асаблівасцей свайго народа, садзейнічаць разуменню непарыўнай сувязі паміж пакаленнямі.

Бібліятэкі праводзяць актыўную работу па **прафілактыцы бяспекі жыццядзейнасці**. На працягу тыдня прайшлі прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджванні надзвычайных сітуацый, правапарушэнняў і злачынстваў.

**10 чэрвеня. ЦРБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі правялі гадзіну бяспекі «Лето без происшествий». На мерапрыемства быў запрошаны інспектар ІСН Лунінецкага РАУС Руслан Юр'евіч Каржаневіч. Ён падрабязна расказаў пра тое, да якога часу сутак дзецям можна знаходзіцца на вуліцы. Усе разам упомнілі правілы дарожнага руху, абмяркавалі розныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць пры катанні на ровары або роліках. Напрыканцы мерапрыемства закранулі такую тэму, як «зачэпінг».

**11 чэрвеня. Мікашэвіцкая г.б.** Для дзяцей з прышкольных лагераў прайшла інфармацыйная гадзіна «Мечтают взрослые и дети о безопасности на всей планете". Бібліятэкар растлумачыла дзецям, што такое бяспека, расказала пра правілы бяспекі. Мерапрыемства суправаджалася вясёлымі гульнямі і конкурсамі.
**11 чэрвеня. ЦРБ**. Для вучняў СШ №2 правялі бібліятэчны ўрок «Правила безопасного поведения в Интернете». Бібліёграф пазнаёміла прысутных з небяспекамі, якія падцікоўваюць дзяцей у сетцы Інтэрнэт і правіламі, якія дапамогуць пазбегнуць гэтых небяспек. Напрыканцы мерапрыемства быў прадэманстраваны відэаролік "Інфармацыйная бяспека ў Інтэрнэце".
**12 чэрвеня. ЦДБ.** У бібліятэцы прайшла інфагадзіна «Методы и мотивы злоумышленников в онлайн-играх».
**12 чэрвеня. Мікашэвіцская г. б.** Бібліятэкары правялі гутарку-дыялог для дзяцей прышкольных лагераў. Вядучыя заваструлі ўвагу дзяцей на кібербяспецы, распавялі аб правілах паводзін у сетцы і паказалі сацыяльны відэаролік «Аб бяспецы ў інтэрнэце і сацыяльных сетках».

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Вулькаўскай-2** с.б. прайшла гадзіна інфармацыі «Безопасность детей в интернете», у **Палескай** с.б. правялі гадзіну праблемных пытанняў «На страже цифровой безопасности», у **Лунінскай** с.б. – прафілактычная гутарка «Безопасный интернет» і інш.
**21 чэрвеня. ЦРБ**. На XII рэгіянальным фестывале "Лунінецкія клубніцы" была арганізавана бібліятэчная пляцоўка "Литературный дворик". Увазе наведвальнікаў прадставілі кніжныя выставы "Зноў паспелі красуні-клубніцы» і «Лунінеччына літаратурная», інфармацыйны стэнды "ФотаІмгненні: "Лунінецкія клубніцы", "Пра клубніцы словамі мясцовых паэтаў", выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Цуды сваімі рукамі" работнікаў бібліятэк сістэмы.
Галоўная падзея "Литературного дворика» - паэтычныя чытанні з удзелам народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Литературная провинция» цэнтральнай раённай бібліятэкі

Для дзяцей працавала гульнявая зона, дзе яны маглі рамаляваць, паўдзельнічаць у конкурсах і адказаць на пытанні віктарыны "З казачнага куфэрка". Усе жадаючыя мелі магчымасць набыць сувеніры: ляльку Тыльду і магніт са святочнай эмблемай.
На свяце адбылося ўзнагароджанне пераможцаў конкурсаў літаратурных твораў, малюнкаў, бібліятэчных куткоў на "клубнічную" тэматыку. Пераможцам у конкурсе бібліятэчных куткоў стала Рэдзігераўская сельская бібліятэка.

Упершыню "Літаратурны дворык" наведалі літаратары і калегі-бібліятэкары з Баранавіцкага і Ганцавіцкага раёнаў. Сваёй творчасцю з лунінчанамі дзяліліся ўдзельнікі літаратурна-музычнай гасцёўні "Крыніца" цэнтральнай раённай бібліятэкі ім. Я Чачота ДУК "Баранавіцкая РЦБС" і пісьменніцы г.Ганцавічы і Ганцавіцкага раёна Аксана Карповіч і Ніна Кавальчук, якія былі ўзнагароджаны дыпломамі і падарункамі за ўдзел у

конкурсе вершаў, апавяданняў, басен, анекдотаў “Мой клубничный край” *(Лунінецкія навіны. 2025. 25 чэрвеня. С.4)*

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню памяці і смутку.**
**20 чэрвеня. Мікашэвіцкая г.б.** Для ўдзельнікаў клуба “САМИ” правялі ўрок мужнасці “Память огненных лет”.
**22 чэрвеня. ЦДБ.** Прайшоў інфармацыйны урок «Дети и война».
**22 чэрвеня. ЦРБ.** У актавай зале бібліятэкі прайшоў літаратурны рэквіем «Этот день изменил жизнь многим». Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным аб першых гадзінах пачатку Вялікай Айчыннай вайны, аб абароне Брэсцкай крэпасці.

Да Дня памяці і смутку у **Кажан-Гарадоцкай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла гадзіна памяці «И будет помнить мир спасенный…», у **Любанскай сельскай бібліятэцы** адбылася гадзіна гісторыі «Говорят погибшие герои», у **Ракітненскай сельскай бібліятэцы** - урок-рэквием «Кто говорит, что на войне не страшно, тот ничего не знает о войне», у **Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе** – інфармацыйная гадзіна «Тот самый первый день войны» і інш.

Плаўсюк 4 82 52